Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

За сталінскія кадры

Орган партбюро, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна

№ 3 (216)
Аўторак
22
лютага
1955 г.

Цана 20 кап.

РАШАЮЧЫЯ ДНІ ПЕРАДВЫБАРЧАЙ КАМПАНІІ

Працоўныя Беларускай ССР дзейсна рыхтуюцца сустрэць дзень выбараў у Вярхоўны Совет БССР і мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных новымі творчымі дасягненнямі. Кожны дзень прыносіць звесткі аб выдатных поспехах працаўнікоў прамысловасці і сельскай гаспадаркі. Разам з усімі брацкімі народамі нашай краіны беларускі народ прарабіў грандыёзную работу па выкананню пятага пяцігадовага плана ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі.

Велізарныя поспехі дасягнуты ў галіне навукі, літаратуры і мастацтва. За чатыры гады, прайшоўшыя з моманту апошніх выбараў у Вярхоўны Совет БССР, нашы пісьменнікі, паэты, кампазітары, артысты, мастакі стварылі рад высокаідэйных мастацкіх твораў, якія ўзбагацілі скарбніцу беларускай нацыянальнай культуры. Яркім сведчаннем гэтага з'яўляецца праходзіўшая ў Маскве дэкада беларускай літаратуры і мастацтва.

Вучоныя нашай рэспублікі плённа працавалі над вырашэннем важнейшых навуковых праблем, якія садзейнічаюць паспяховаму ажыццяўленню надзённых задач умацавання нашай Радзімы.

Комуністычная партыя і Совецкі ўрад праяўляюць вялікія клопаты аб нашай моладзі. Сотні тысяч юнакоў і дзяўчат Беларусі навучаюцца ў вышэйшых і сярэдніх навучальных установах. Ні адна краіна ў свеце не ведае такога аб'ёму навучання. Студэнты авалодваюць перадавой совецкай навукай, адлюстроўваючай патрэбы социялістычнага грамадства. Партыя і ўрад уважліва і беражліва адносяцца да спецыялістаў усіх галін ведаў. Людзі, скончыўшыя вышэйшыя навучальныя ўстановы, ведаюць, што ім гарантавана права на працу, што яны змогуць з поспехам прымяніць усе свае здольнасці і веды на карысць народа.

У дзень выбараў, 27 лютага 1955 года, працоўныя нашай рэспублікі будуць галасаваць за далейшы ўздым народнай гаспадаркі, за рост абароназдольнасці нашай краіны, за росквіт социялістычнай культуры.

Нашы прапагандысты і агітатары знаходзяцца на перадавым участку ідэалагічнага фронта. Сваім жывым, даходлівым словам яны павінны давесці да кожнага выбаршчыка поспехі нашага народа. Важна, каб у сваіх гутарках яны расказвалі і на канкрэтных прыкладах паказвалі выключную перавагу совецкага дзяржаўнага і грамадскага ладу, клопаты совецкай дзяржавы па павышэнню матэрыяльнага і культурнага ўзроўню народа.

Іменна так і паступаюць у сваёй рабоце агітатары-комсамольцы Байрашэўская, Кавалевіч, Пашына, Гутарава, Гілеўская, Шульц і многія другія. Яны дзейсна рыхтуюцца да гутарак з выбаршчыкамі і праводзяць іх на высокім ідэйна-палітычным узроўні. Агітатарам у іх рабоце вялікую дапамогу аказваюць факультэцкія партыйныя і другія грамадскія арганізацыі, агітпункт. З агітатарамі сістэматычна праводзяцца семінары і нарады, удзельнікі якіх дзеляцца сваім вопытам, атрымліваюць канкрэтную дапамогу.

Аднак, у гэтай рабоце маюцца і недахопы. Недастаткова актыўна ўключыліся ў перадвыбарчую кампанію профсаюзныя і комсамольскія арганізацыі факультэтаў. Невыпадкова таму, што многія агітатары праводзяць гутаркі яшчэ на нізкім ідэйна-палітычным узроўні, рэдка бываюць у сваіх выбаршчыкаў. Так, напрыклад, агітатары-комсамольцы Васільеў (IV курс гістарычнага факультэта), Каралёва (III курс аддзялення журналістыкі), Смыкава (філалагічны факультэт), Рымашэўская (геолага-геаграфічны факультэт), Дзікалава, Богуш, правялі толькі па адной—дзве гутаркі, а некаторыя з іх, як, напрыклад, Нікіфараў, амаль зусім не сустракаліся з сваімі выбаршчыкамі. Паслабілі сваю работу ў гэтай выбарчай кампаніі і агітбрыгады.

Выбарчая кампанія ўступіла ў свой апошні, завяршаючы этап. Па ўсёй рэспубліцы праходзяць сустрэчы кандыдатаў у дэпутаты са сваімі выбаршчыкамі. У застаўшыяся дні неабходна ўжо дасканала прадумаць усе арганізацыйныя мерапрыемствы на дзень выбараў, узмацніць масава-палітычную работу сярод выбаршчыкаў. Свяшчэнны абавязак кожнага агітатара—давесці да свядомасці сваіх выбаршчыкаў, што галасуючы за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных, яны тым самым будуць галасаваць за шчаслівае жыццё совецкага народа, за светлае будучае нашай краіны.

У дзень выбараў у Вярхоўны Совет БССР і мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных наш народ яшчэ раз прадэманструе сваё непарушнае маральна-палітычнае адзінства, сваю згуртаванасць вакол Комуністычнай партыі і Совецкага ўрада, сваю непахісную волю ў пабудове бясклясавага комуністычнага грамадства.

ВІТАЕМ РАШЭННІ СЕСІІ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

Нядаўна ва універсітэце адбыўся мітынг, прысвечаны рашэнням сесіі Вярхоўнага Совета СССР.

Пасля ўступнага слова, зробленага сакратаром партыйнай арганізацыі філалагічнага факультэта таварышам Булацкім, дацэнт Д. Е. Фактаровіч зачытаў тэкст прынятай сесіяй Дэкларацыі.

На трыбуне кандыдат філалагічных навук В. Ф. Крыўчык.

— Дэкларацыя Вярхоўнага Совета СССР,—гаворыць яна,—з'яўляецца яскравым адлюстраваннем міралюбівай палітыкі Совецкага Саюза. Ад імя прафесарска-выкладчыцкага састава я заяўляю, што мы цалкам падтрымліваем гэтую палітыку.

Затым выступіў студэнт IV курса філалагічнага факультэта І. Шішчанка.

— Мы, совецкія студэнты,—сказаў ён,—з радасцю сустрэлі і адзінадушна падтрымліваем рашэнні сесіі Вярхоўнага Совета СССР і прынятую сесіяй Дэкларацыю. Мы будзем яшчэ больш упарта авалодваць ведамі, каб як мага больш карысці прынесці любімай Айчыне.

Удзельнікі мітынга прынялі рэзалюцыю, у якой заяўляюць, што яны адзінадушна адабраюць рашэнні сесіі Вярхоўнага Совета СССР, накіраваныя на далейшае ўмацаванне магутнасці нашай Радзімы і горача падтрымліваюць знешнюю палітыку Совецкага ўрада.

П. УЛАДЗІМІРАЎ.

ВЕЧАР СОВЕЦКА-КІТАЙСКАЙ ДРУЖБЫ

14 лютага ў Мінску адбыўся ўрачысты вечар, прысвечаны пятай гадавіне з дня падпісання дагавору аб дружбе, саюзе і ўзаемадапамозе паміж Совецкім Саюзам і Кітайскай Народнай Рэспублікай. Актавую залу Мінскага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага запоўнілі рабочыя і служачыя, вучоныя і студэнты. Сцэну ўпрыгожваюць дзяржаўныя сцягі Совецкага Саюза, Беларускай ССР і Кітайскай Народнай Рэспублікі.

Старшыня Праўлення Беларускага таварыства культурнай сувязі з замежжам Г. Н. Верасаў уступным словам адкрывае вечар. Велічна гучаць мелодыі гімнаў Кітайскай Народнай Рэспублікі і Совецкага Саюза. Затым слова для даклада «Вялікая дружба ў імя міру і бяспекі народаў» прадастаўляецца прарэктару Беларускага дзяржаўнага універсітэта Г. А. Павеццеву. Ён гаворыць аб дасягненнях кітайскай прамысловасці, сельскай гаспадаркі і навукі. Дакладчык падкрэслівае, што Совецкі Саюз, выконваючы дагавор ад 14 лютага 1950 года, аказвае вялікую дапамогу кітайскаму народу ў яго барацьбе за пабудову соцыялізма, за мір ва ўсім свеце. Значны ўклад у справу ўмацавання дружбы паміж двума вялікімі краінамі зрабіў і беларускі народ. На новабудоўлях Кітая можна ўбачыць аўтамашыны з маркай Мінскага аўтазавода. У соўгасе «Дружба» будуць працаваць трактары «Беларусь». На кітайскую мову перакладзены творы Я. Купалы і Я. Коласа, А. Куляшова. і В. Вольскага. Кітайскі кіноглядач пазнаёміўся з фільмамі «Канстанцін Заслонаў», «Совецкая Беларусь». У той-жа час беларускі народ ведае і любіць творы кітайскай літаратуры і кіномастацтва. У Совецкай Беларусі неаднаразова пабывалі пасланцы кітайскага народа, кітайскія мастацкія калектывы. Свой даклад тав. Г. А. Павеццеў заканчвае здравіцай у чэсць народаў Кітая і СССР.

Слова бярэ падпалкоўнік Д. Д. Кашалёў. Ён расказвае аб барацьбе Совецкай Арміі за вызваленне кітайскай зямлі ад японскіх захопнікаў, дзеліцца сваімі асабістымі ўражаннямі аб тым гарачым прыёме, які аказваў совецкім воінам кітайскі народ.

На трыбуне прафесар нашага універсітэта, сапраўдны член Акадэміі навук БССР Т. Н. Годнеў. Ён гаворыць аб умацаванні творчай сувязі паміж беларускімі і кітайскімі вучонымі.

— Працы беларускіх вучоных,—сказаў Т. Н. Годнеў,—ведаюць і выкарыстоўваюць вучоныя народнага Кітая.

Удзельнікі вечара паслалі тэлеграму Цэнтральнаму совету Таварыства кітайска-совецкай дружбы.

У заключэнне прысутныя праглядзелі кітайскі мастацкі фільм «Тэрміновае пісьмо».

А. ІОСІФАВІЧ.

ПІСЬМЕННІКІ Ў ГАСЦЯХ У СТУДЭНТАЎ

Дэкада беларускага мастацтва і літаратуры ў Маскве—свята нашага народа, вялікі экзамен яго творчай сталасці. Дэкадзе папярэднічалі шырокія вечары сустрэчы работнікаў мастацтва і літаратуры з грамадскасцю рэспублікі. Перад ад'ездам на дэкаду група пісьменнікаў сустрэлася са студэнтамі-завочнікамі універсітэта, з тымі, хто праводзіў канікулы ў Мінску. 58 аўдыторыя была перапоўнена. Яшчэ да пачатку выступленняў у прэзідыум паступілі шматлікія пажаданні.

Удзельнікі II Усесаюзнага з'езда пісьменнікаў Павел Кавалёў і Максім Лужанін падзяліліся сваімі ўражаннямі аб з'ездзе, падрабязна ахарактарызавалі яго вынікі.

Свае новыя творы прачыталі М. Аўрамчык, А. Бачыла, М. Лужанін.

Павел Кавалёў, адказваючы на пытанні прысутных, падрабязна расказаў аб планах віднейшых беларускіх літаратараў, якія накіроўваюцца на творчую справаздачу ў Маскву.

Ад імя сабраўшыхся дацэнт Д. Е. Фактаровіч падзякаваў пісьменнікаў і заверыў іх, што ва універсітэце з вялікай увагай будуць сачыць за ходам дэкады, чакаць звароту пісьменнікаў з Масквы і новых сустрэч з імі.

СУСТРЭЧА З КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ

Нядаўна ў клубе універсітэта адбылася сустрэча кандыдата ў дэпутаты Мінскага абласнога Совета дэпутатаў працоўных, прафесара нашага універсітэта Нікалая Фёдаравіча Ермоленка са сваімі выбаршчыкамі.

Палітдавераны Г. С. Маханёк коратка расказаў сабраўшымся аб навуковай і грамадскай дзейнасці іх кандыдата. Сапраўдны член Акадэміі навук БССР Н. Ф. Ермоленка ўсё сваё жыццё прысвяціў справе навукі, справе служэння народу, Радзіме. За трыццаць год навуковай і педагагічнай дзейнасці Н. Ф. Ермоленка напісаў больш дзевяноста навуковых прац, многія з якіх маюць вялікае значэнне для народнай гаспадаркі, і падрыхтаваў многа высокакваліфікаваных спецыялістаў. Будучы дэпутатам Мінскага абласнога Совета дэпутатаў працоўных, тав. Ермоленка апраўдаў давер'е выбаршчыкаў.

Выступае кандыдат хімічных навук дацэнт А. С. Баркан.

— Таварыш Ермоленка з'яўляецца прадстаўніком першага пакалення беларускіх нацыянальных кадраў,—гаворыць прамоўца,—ён заўсёды адчуваў свой абавязак перад народам, які ўзняў яго на вяршыні навукі. Дзякуючы самаадданай, настойлівай



працы, лекцыі прафесара Ермоленка з'яўляюцца сапраўднай школай навуковай думкі. Я думаю,—заканчвае сваё выступленне т. Баркан,—што выкажу думку ўсіх прысутных, калі скажу, што за такога кандыдата мы ўсе, як адзін, аддадзім свае галасы.

Слова бярэ студэнтка III курса хімічнага факультэта Н. Аліко.

— Мы любім і паважаем Нікалая Фёдаравіча,—гаворыць яна,—яго лекцыі заўсёды глыбока змястоўныя і цікавыя. Студэнты хімічнага факультэта ведаюць Нікалая Фёдаравіча не толькі як выкладчыка, але і як старэйшага друга, чулага таварыша, які заўсёды цікавіцца і вучобай, і жыццём, і бытам студэнтаў.

Затым выступае, цёпла сустрэты прысутнымі, прафесар Н. Ф. Ермоленка.

Ён дзякуе калектыву універсітэта, які вылучыў яго кандыдатам ў дэпутаты, за аказанае яму ўжо трэці раз давер'е і запэўнівае выбаршчыкаў, што не пашкадуе сіл і ведаў, каб з чэсцю апраўдаць яго.

— Я прыкладу ўсе свае намаганні,—заканчвае свае выступленне Н. Ф. Ермоленка,—каб унесці новы ўклад у нашу совецкую навуку.

В. ПАЎЛОВІЧ.

Напярэдадні выбараў у Советы

Выбарчая кампанія ўступіла ў самы рашаючы перыяд. У гэтыя дні ўсе намаганні партыйнай арганізацыі універсітэта накіраваны на шырокую агітацыю за вылучаных кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных, за актыўны ўдзел у выбарах усіх выбаршчыкаў. У палітычнай рабоце сярод выбаршчыкаў выкарыстоўваюцца ўсе формы і метады, якія апраўдалі сябе ў перыяд мінулагодніх выбараў, г. зн. лекцыі, даклады, гутаркі, сходы, вечары мастацкай самадзейнасці, кіно, справаздачы дэпутатаў перад выбаршчыкамі і г. д.

Уся масава-палітычная работа сярод выбаршчыкаў праводзіцца ў сучасны момант у агітпункце, а таксама на кватэрах выбаршчыкаў. У агітпункце можна заўсёды ў дастатковай колькасці знайсці газеты і часопісы, выбарчую літаратуру. Арганізаван стол даведак. Звяртаюць на сябе ўвагу тэматычныя транспаранты на тэмы: «Аб уздыме матэрыяльнага і культурнага ўзроўню жыцця совецкага народа», «Літаратура да выбараў у Вярхоўны Совет БССР і мясцовыя Советы». Выстаўлен стэнд з біяграфіямі кандыдатаў у дэпутаты мясцовых Советаў.

Работа агітпункта праводзіцца па складзенаму плану, які зацвярджан партыйным бюро універсітэта. План прадугледжвае правядзенне кожную суботу і нядзелю культурна-масавых мерапрыемстваў у клубе універсітэта.

У бліжэйшы час будуць праведзены вечары выбаршчыкаў на тэмы: «Аб Дзяржаўным бюджэце СССР на 1955 год і аб выкананні Дзяржаўнага бюджэта за 1953 год», «Выкарыстанне атамнай энергіі ў мірных мэтах», гутаркі агітатараў з выбаршчыкамі на даму аб дні Совецкай Арміі і Флота, аб совецкай выбарчай сістэме.

Змястоўную масава-палітычную работу сярод насельніцтва праводзяць агітатары Кавалёва (гістфак), Шульц (фізмат), Гілеўская (біёлага-глебавы факультэт), Пашына (біёлага-глебавы факультэт) і другія. Наведваючы кватэры працоўных па 2—3 разы ў тыдзень, яны знаёмяць іх з біяграфіямі кандыдатаў у дэпутаты, растлумачваюць асновы совецкай дэмакратыі. Асабліва вялікую цікавасць праяўляюць выбаршчыкі да гутарак тав. Байрашэўскай. Яны задаюць агітатару масу пытанняў, дзеляцца сваімі ўражаннямі аб падзеях, якія праходзяць у нашай краіне і за рубяжом.

Побач з гэтым, трэба адзначыць сур'ёзныя недахопы ў пастаноўцы палітычнай агітацыі.

Некаторыя агітатары фармальна адносяцца да свайго комсамольскага абавязку, абмяжоўваюцца ў сваёй рабоце толькі запрашэннем выбаршчыкаў на выбарчы ўчастак (Еўсеева, Дзідовіч). Агітатары Нікіфараў і Краснеўская (аддзяленне журналістыкі), Смыкава (філалагічны факультэт), Рымашэвіч (геолага-геаграфічны факультэт) ні разу не былі ў выбаршчыкаў.

Мала ўдзяляе ўвагі рабоце агітатараў камітэт комсамола. Амаль зусім ухіліўся ад работы ў перадвыбарчай кампаніі прафком універсітэта. Усё гэта адмоўна адбіваецца на масава-палітычнай рабоце сярод насельніцтва.

У сучасны момант нашы агітатары расказваюць выбаршчыкам аб кандыдатах непарушнага блоку комуністаў і беспартыйных, аб іх самаахвярным, чэсным служэнні справе партыі і дзяржавы. Масава-палітычная работа агітатараў павінна садзейнічаць таму, каб усе выбаршчыкі нашага ўчастка адзінадушна аддалі свае галасы за лепшых сыноў і дачок совецкага народа—кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных.

Н. ПАЎЛЕНКА.

Буду галасаваць упершыню

27 лютага я буду ўпершыню галасаваць за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных.

Лепшых сыноў і дачок пасылае беларускі народ у органы дзяржаўнай улады.

Галасуючы за кандыдатаў непарушнага блока комуністаў і беспартыйных, я буду галасаваць за трывалы мір, за шчасце і светлае будучае нашай Радзімы.

Нам, студэнтам, не трэба ў цяжкіх умовах дабівацца права голасу. Усе совецкія людзі маюць гэтае права.

Далёка не так у капіталістычных краінах, дзе ўладарнічаюць іншыя законы, дзе працоўныя знаходзяцца над страшэнным прыгнётам капіталістычнага ладу.

Гэта можна сказаць і аб былой панскай Польшчы.

Я нарадзіўся ў адной з вёсак Заходняй Беларусі. Гора і цемра былі пастаяннымі спадарожнікамі жабрацкага жыцця маіх бацькоў. Хоць сям'я была зусім невялікая, усёроўна даводзілася жыць галадаючы, пазычаць у суседзяў кавалак чорнага хлеба.

Толькі з прыходам Совецкай Арміі наша сям'я, як і працоўныя ўсёй Заходняй Беларусі, атрымала права на працу, на адпачынак і на адукацыю.

Выхадзец з беднай сялянскай сям'і, ці мог я марыць аб тым, што перада мной гасцінна расчыняцца дзверы універсітэта, што я буду калі-небудзь выбіраць у вышэйшы орган дзяржаўнай улады.

Вось чаму зараз з пачуццём вялікай гордасці за нашу цудоўную Радзіму я аддам свой голас за самых лепшых сыноў і дачок нашага народа.

Б. УЛЬЯНКА,
студэнт II курса аддзялення журналістыкі.

Чула прыслухоўвацца да голасу выбаршчык

Складаная і адказная работа агітатара. У першыя дні, калі комсамольская група нашага курса даручыла мне гэтую грамадскую нагрузку, перада мной паўстала многа непрадбачаных цяжкасцей. Сустракаліся пытанні, з якімі я была мала знаёма. Аднак дружны згуртаваны калектыў дапамог мне авалодаць метадам работы.

12 снежня 1954 года ў нас праходзілі выбары ў народныя суды. Выбаршчыкі, з якімі я працавала ў час гэтай выбарчай кампаніі, лічацца за мной і ў сучасны момант. Гэта, безумоўна, у многім аблягчае работу, садзейнічае лепшаму ўзаемаразуменню.

Працуючы з вялікай групай выбаршчыкаў, розных па свайму характару, развіццю і інтарэсах, я стараюся падабраць самыя разнастайныя тэмы для гутарак і дакладаў. Але гэтага яшчэ недастаткова. Каб па-сапраўднаму зацікавіць выбаршчыка, неабходна чула прыслухоўвацца да яго голасу, улаўліваць у пытаннях, сфармуляваных іншы раз вельмі цьмяна і недакладна, чым больш за ўсё цікавіцца той або іншы выбаршчык. І зусім неправамерна думаць, што можна абмежавацца толькі тымі тэмамі, якія прапануюцца агітатару на семінарскіх занятках.

Гутаркі я праводжу на кватэры каго-небудзь з выбаршчыкаў. Туды збіраюцца ўсе выбаршчыкі, з якімі я працую.

Цікава праходзіць абмеркаванне самых рознастайных пытанняў. Выбаршчыкі задаюць пытанні, выказваюць вельмі цікавыя думкі, іншы раз і самі расказваюць.

Сучасная выбарчая кампанія вельмі адказная. Спецыфіка яе заключаецца ў тым, што выбары праводзяцца адначасова як у Вярхоўны Совет БССР, так і ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

Абавязак кожнага агітатара—прыкласці ўсе намаганні і энергію, каб дастойна сустрэць дзень выбараў.

БАЙРАШЭЎСКАЯ,
студэнтка II курса гістарычнага факультэта.

За радаснае і шчаслівае жыццё

Мне вельмі часта прыходзіцца параўноўваць жыццё маіх бацькоў з жыццём сваіх братоў і сясцёр. Голад і галеча загналі майго бацьку, беззямельнага селяніна, на далёкія заводы Данбаса. Будучае ён бачыў толькі на «сваёй зямлі» і ўсё жыццё біўся, як рыба аб лёд, дзеля гэтага праклятага кавалка зямлі.

Вучыцца яму не давялося: навучэнцам першага класа царкоўна-прыхадской школы, ён выкрыў свайго настаўніка-папа ў «пралюбадзействе», за што яго выключылі са школы. Ніякія скаргі павятоваму начальству, ніякія просьбы не вярнулі яго ў школу. На гэтым і скончылася бацькава «адукацыя».

І толькі Вялікая Кастрычніцкая рэволюцыя адкрыла бацькам дарогу да новага, шчаслівага жыцця. У перыяд ліквідацыі непісьменнасці бацька і маці праніклі ў таямніцы пісьма і чытання. Зараз бацька захапляецца Жуль Вернам, маці цікавіцца газетамі.

Не так пачыналі сваё жыццё мы, іх дзеці. Нам не трэба было выбівацца з апошніх сіл, каб набыць сабе кавалак зямлі. Наша жыццё пачалося з заняткаў у школе.

Для ўсіх нас няма нічога больш высакароднага, чым чэсна працаваць, аддаваць свае сілы на карысць народа і Радзімы.

Таму, галасуючы за кандыдатаў народнага блока комуністаў і беспартыйных, я буду галасаваць за шчаслівае і радаснае жыццё, за мір ва ўсім свеце.

Л. МІРОНЧЫКАЎ,
студэнт IV курса гістарычнага факультэта.

АГІТАТАР ІРЫНА ПАШЫНА

Ірына Пашына паволі падымаецца на чацверты паверх дома № 1, што па Ленінградскай вуліцы. Яе стрымгалоў абганяе маленькая ружавашчокая Людачка.

— Бабуля, агітатар да нас прыйшоў, адчыні хутчэй,—крычыць яна праз замочную адтуліну.

У дзвярах паказваецца Анна Цімафееўна Стрэмбіцкая:

— А, Іра! Добры дзень! Я вельмі рада, што вы прыйшлі. Мы неяк ужо прызвычаіліся да вас, як да сваёй. Распранайцеся хутчэй.

Праз некалькі хвілін сабіраецца ўся сям'я Стрэмбіцкіх: Анна Цімафееўна, яе муж, сын Уладзіслаў. Прыбегла змораная Людачка разам са сваёй сяброўкай, заглянула суседка Зінаіда Канстанцінаўна Якушына. Зайшлі суседзі Бондаравы. Усе рассаджваюцца па-дамашняму: на крэслах, на канапе, на ложку.

— Сёння я раскажу вам аб рабоце другой сесіі Вярхоўнага Совета СССР,—пачынае гутарку Ірына.— Увесь совецкі народ з гарачым адабрэннем сустрэў рашэнні сесіі, накіраваныя на далейшае ўмацаванне нашай эканомікі, на ўмацаванне міру паміж народамі.

Пашына падрабязна перасказвае змест даклада Вячэслава Міхайлавіча Молатава аб міжнародным становішчы, прамову Нікалая Аляксандравіча Булганіна, характарызуе Дзяржаўны бюджэт Совецкага Саюза, знаёміць з Дэкларацыяй, прынятай Вярхоўным Советам СССР.

— Так. Гэта мудрыя рашэнні, рашэнні дзеля нашага шчасця, дзеля нашага жыцця,—гаворыць у роздуме Зінаіда Канстанцінаўна.

— З матэрыяламі сесіі Вярхоўнага Совета мы ўжо азнаёміліся самі. А вось гутарку амерыканскіх журналістаў з Маршалам Совецкага Саюза Жукавым я яшчэ не паспеў прачытаць. Перадайце, калі ласка, яе змест,—просіць Уладзіслаў.

Ірына з гатоўнасцю задавальняе гэтую просьбу. Яна зачытвае найбольш важныя месцы з гутарак кіраўнікоў нашай партыі і ўрада з амерыканскімі журналістамі.

— Я хацела вам яшчэ расказаць аб дэкадзе беларускага мастацтва і літаратуры ў Маскве. Масквічы вельмі цёпла сустракаюць спектаклі тэатра оперы і балета, тэатраў імя Янкі Купалы і Якуба Коласа, рускага драматычнага тэатра, канцэрты нашых лепшых мастацкіх самадзейных калектываў. Маскоўскі друк дае высокую ацэнку дасягненням беларускага мастацтва і літаратуры. А хваліць сапраўды ёсць за што...

— Я ўчора слухала па радыё оперу Цікоцкага «Дзяўчына з Палесся»,—перабівае Іру Анна Цімафееўна.—Опера мне вельмі спадабалася сваёй меладычнасцю і задушэўнасцю. Калі тэатр вернецца ў Мінск, абавязкова схаджу паслухаць.



— Вось я вам прынесла апошнія нумары часопісаў «Огонёк» і «Маладосць». У іх многа фота дзеячоў беларускага мастацтва. Вось артыстка опернага тэатра Лідзія Ражанава рыхтуецца да спектакля. А на гэтай старонцы—сям'я Паплаўскіх. Трохгадовы Чэсік пад акампанемент чатырохгадовай Ядзі выконвае сваю любімую песенку.

Паволі гутарка пераходзіць на хатнія справы. Ірыне даюць прагледзець альбом з фатаграфіямі. Нехта просіць у Пашынай даведацца, дзе можна дастаць новы медыцынскі прэпарат.

— Сёння ў сем гадзін вечара ва універсітэцкім клубе адбудзецца сустрэча з кандыдатам у дэпутаты Мінскага абласнога Совета, прафесарам нашага універсітэта Нікалаем Фёдаравічам Ермоленка,—паведамляе Ірына.—Абавязкова прыходзьце.

— Дзе мне ўжо там,—адказвае Анна Цімафееўна,—вы-ж ведаеце, што я ўвесь час хварэю.

— Тады я заўтра прыду ізноў і раскажу аб сустрэчы з гэтым вядомым вучоным. Я займаюся на аддзяленні глебазнаўства і таму не мела магчымасці слухаць яго лекцыі. А студэнты хімічнага факультэта вельмі яго любяць.

Пашына хутка апранае паліто і развітваецца з выбаршчыкамі.

— Прыдзіце вы, Уладзік.

— Прыду. Пасля таго як юрыдычны інстытут далучыўся да універсітэта, ён стаў мне як-бы другім домам...

— Ну, да пабачэння.

— Прыходзьце часцей.

Пашына выходзіць на вуліцу. Калючы вецер халодзіць яе пачырванелыя ад хвалявання шчокі. Яна ледзь-ледзь усміхаецца: гутарка ўдалася.

Калі месяц назад сакратар комсамольскага курсавога бюро Леанід Ярашэвіч прапанаваў Пашынай праца ваць агітатарам, яна спачатку аднеквалася:

— Я не змагу.

Але пасля першай гутаркі з выбаршчыкамі праца агітатара ёй спадабалася. Яна рэгулярна наведвала семінары агітатараў, чытала многа дадатковай літаратуры. Вядома, першыя крокі былі нялёгкімі: жыхары замацаваных за ёй кватэр былі служачымі, мелі больш высокую адукацыю, чым Іра. Але яна старалася праводзіць гутаркі жыва і наглядна. Па просьбе выбаршчыкаў Пашына расказала ім аб ролі крытыкі і самакрытыкі ў совецкім грамадстве, аб рэакцыйнай сутнасці парыжскіх пагадненняў, аб жыццёвым і творчым шляху мастака Рэпіна.

Нядаўна на другім курсе аддзялення глебазнаўства адбыўся комсамольскі сход. На ім Ірына падрабязна расказала аб сваёй рабоце, падзялілася вопытам.

— Быць агітатарам — вялікая чэсць для студэнта,—сказаў на сходзе сакратар партыйнай арганізацыі факультэта тав. Андрушчанкаў.—Але, на жаль, такія агітатары, як Ала Свердлікава, яшчэ недобрасумленна адносяцца да сваіх абавязкаў. Яны павінны ўзяць прыклад з Ірыны Пашынай.

М. АДАМАЎ.

Таленавіты вучоны

Ф. І. Фёдараў з'яўляецца таленавітым выхаванцам універсітэта, у сценах якога ён звыш дваццаці год вядзе сваю плённую педагагічную, навуковую і грамадскую дзейнасць.



На працягу апошніх год Ф. І. Фёдараў настойліва працаваў над даследаваннем па прыкладанню метадаў вектарнага і тэнзарнага аналізу і лінейнай алгебры да задач, яшчэ не поўнасцю вырашаных у класічнай электрамагнітнай оптыцы Максвела.

Вучоны Совет Дзяржаўнага аптычнага інстытута імя С. І. Вавілава адзінадушна за манументальную працу «Інварыянтныя метады ў оптыцы анізатропных асяроддзяў» прысудзіў дацэнту Фёдараву вучоную ступень доктара фізіка-матэматычных навук. Работа ўключае ў сябе, з аднаго боку, пытанні метадычныя—прыстасаванне вышэйуказаных метадаў да практыкі спецыяльна аптычных праблем, а з другога,—рашэнне недастаткова даследаваных, а то і зусім некранутых пытанняў, аспрэчванне ўкараніўшыхся недакладнасцей і непаразуменняў.

Галоўны змест работы састаіць ў атрыманні новых вынікаў у галіне крысталаоптыкі, стварэнні новага матэматычнага апарата для атрымання даных па гэтаму заблытанаму раздзелу оптыкі, перабудове ўсяго выкладання крысталаоптыкі і ў абгрунтаванні яе, як і іншых раздзелаў оптыкі, трактоўцы тэрмінаў і ўяўленняў інварыянтных метадаў.

У сваёй рабоце Ф. І. Фёдараў поўнасцю рашае задачу аб вызначэнні амплітуд хваляў, адбітых і пераломленых на аднавосным крыстале ў найбольш агульнай інварыянтнай бінармалі, плоскасці раздзела і плоскасці падання. Карыстаючыся асобай сістэмай электрамагнітных вектараў і іх раскладаннем на галоўныя вектары хістання і палярызацыі і вызначаючы іх па кірунку і велічыне, ён атрымоўвае вельмі простыя, зусім новыя формулы.

У рабоце дасягнуты добрыя вынікі па даследаванню паглынання святла крысталам, што мае не толькі прынцыповы характар, але і вялікую практычную цікавасць. Задача аб асабліва-сцях распаўсюджвання, адбіцця і пераламлення святла для крысталаў ніжэйшай сінгоніі ўпершыню вырашана поўнасцю, правільна і да канца. Знойдзена новая вялікая разнастайнасць аптычных якасцей паглынаючых святло крысталаў. Упершыню дадзена поўнасцю класіфікацыя такіх крысталаў. Дадзен метад набліжанага вызначэння ўсіх аптычных параметраў, паглынаючых крысталаў, што таксама мае вялікае значэнне. Гэтым створана новая глава крысталаоптыкі, а таксама практычнай крысталаграфіі, петраграфіі і мінералогіі.

Па водгуках буйнейшых спецыялістаў у гэтай галіне фізікі, Ф. І. Фёдараў сваёй працай зусім пераўтварыў і стварыў новы напрамак у навуковай крысталаоптыцы. Створаны ім метад з'яўляецца буйным крокам наперад для стварэння цэлай школы ў гэтым кірунку.

Калектыў студэнтаў і навуковых работнікаў нашага універсітэта адзінадушна вылучыў загадчыка кафедрай тэарэтычнай фізікі і механікі Фёдара Іванавіча Фёдарава, аднаго з лепшых навуковых работнікаў універсітэта ў галіне тэарэтычнай фізікі, кандыдатам у дэпутаты Ленінскага раённага Совета дэпутатаў працоўных горада Мінска.

У дзень выбараў у Советы дэпутатаў працоўных мы аднадушна аддадзім свае галасы за гэтага дастойнага кандыдата ў дэпутаты.

С. КІСЛЯКОЎ,
нам. дэкана фізіка-матэматычнага ф-та.

БОЛЬШ УВАГІ УНІВЕРСІТЭЦКАЙ БІБЛІЯТЭЦЫ

Вялікую і карысную работу праводзяць работнікі нашай бібліятэкі, абслугоўваючы студэнтаў стацыянара і завочнага факультэта, прафесарска-выкладчыцкі састаў і аспірантаў. Бібліятэка штодзённа камплектуецца мастацкай літаратурай і новымі каштоўнымі кнігамі і часопісамі па разнастайных галінах навукі. Яна з'яўляецца адной з буйнейшых бібліятэк ВНУ рэспулікі. На яе паліцах захоўваецца чвэрць мільёна кніг, часопісаў і брашур. Лік абанентаў складае амаль чатыры тысячы. Бібліятэка мае сувязь з 460 навуковымі ўстановамі і бібліятэкамі ўсіх саюзных рэспублік і краін народнай дэмакратыі.

Нямала ўвагі бібліятэцы ўдзяляе рэктарат, бібліятэчны совет. Але ўсё-ж гэтага недастаткова. Перш за ўсё, бібліятэка патрабуе істотнага пашырэння памяшкання, бо кожны год фонд бібліятэкі павялічваецца на 25—27 тысяч кніг; плошча-ж, якую займае бібліятэка, на жаль, не пашыраецца; кнігі даводзіцца складваць у праходах і па кутках паміж паліцамі. Перагружанасць бібліятэчных памяшканняў кнігамі зусім недапушчальна ў многіх адносінах: і ў сэнсе карыстання і захоўвання кніжнага фонду, і ў супроцьпажарных адносінах. Нарэшце, такое становішча стварае пустую работу па шматразовай перакладцы кніг пры выдачы.

Для наладжвання нармальнага захоўвання кніг і карыстання імі неабходна было-б правесці рад мерапрыемстваў. Па-першае, бібліятэцы неабходна прадаставіць дадатковае памяшканне ў цокальным паверсе біялагічнага корпуса. Затым, устанавіць больш умяшчальныя сцелажы ў абанементным аддзяленні, а старыя перанесці ў цокальнае памяшканне. Кніжныя шафы ў калідорах і чытальнай зале патрэбна замяніць спецыяльнымі кніжнымі шафамі, разлічанымі на ўсю вышыню памяшкання. Старыя шафы можна выкарыстаць для дадатковага камплектавання бібілятэкі ў кабінетах кафедраў. Нарэшце, кнігасховішча ў цокальным паверсе патрабуе нармальнай для захавання кніг тэмпературы. Для гэтага патрэбна ўстанавіць краны для рэгулявання нагрэву радыятараў.

Выключна важнае значэнне мае бібліятэка для студэнтаў-завочнікаў. У сувязі з пашырэннем завочнага навучання неабходна арганізацыя самастойнай бібліятэкі завочнага факультэта. Такая бібліятэка, маючы ў сваім распараджэнні кніжны фонд, вылучаны з саставу асноўнай бібліятэкі універсітэта, а таксама ўласны абслугоўваючы персанал, магла-б арганізаваць сістэматычную рассылку кніг студэнтам-завочнікам. Можна не сумнявацца, што паспяховасць завочнікаў ад гэтага павысіцца і адсеў студэнтаў паменшыцца. Трэба толькі паскорыць здзяйсненне гэтага вельмі карыснага мерапрыемства.

Добрая арганізацыя работы бібліятэкі залежыць таксама і ад усяго калектыву універсітэта. Кожны студэнт, выкладчык павінны беражліва абыходзіцца з кнігамі, не затрымліваць іх у сябе. На вялікі жаль, у нас ёсць яшчэ студэнты, якія неахайна абыходзяцца з кнігамі, не здаюць іх у тэрмін. Студэнты Зенюк (III курс геолага-геаграфічнага факультэта), Крэмень (III курс аддзялення журналістыкі), Васільева (IV курс гістфака) і другія не здаюць кніг у бібліятэку па году і больш. Назіраюцца такія-ж факты і сярод выкладчыкаў універсітэта. Аштрафаваны чытальнай залай за доўгую затрымку кніг такія студэнты, як В. Крэмез (V курс фізмата). Э. Бародзіч, В. Сцёпін, А. Кахновіч (гістарычны факультэт), А. Галчанаў (IV курс філфака), М. Абразнова (I курс філфака), Б. Хлынцаў (II курс аддзялення журналістыкі), Т. Махнач (II курс геолага-геаграфічнага факультэта). Назіраюцца факты варварскіх адносін да кнігі. Так, студэнтка I курса юрыдычнага факультэта Дамашэўская вырвала некалькі старонак з падручніка па логіцы.

Аддзел кадраў і бухгалтэрыя павінны дапамагчы спагнаць літаратуру ад даўжнікоў і асоб, якія пакідаюць універсітэт. Толькі пры ўмове дапамогі з боку рэктарата і сур'ёзных адносін чытачоў да кнігі бібліятэка зможа значна палепшыць сваю работу.

В. ДЕМЕНЦЕЎ,
старшыня бібліятэчнага совета,
Р. ЛЮБІНА,
дырэктар бібліятэкі.

АБМЕРКАВАННЕ ДЫПЛОМНАЙ РАБОТЫ НА ПАСЯДЖЭННІ КАФЕДРЫ

На адбыўшымся днямі пасяджэнні кафедры зарубежнай літаратуры студэнтка-выпускніца завочнага факультэта тав. Ерусалімчык праінфармавала прысутных аб ходзе напісання сваёй дыпломнай работы «Артыкулы Анатоля Франса і Рамэна Ралана аб рускім народзе».

Члены кафедры адзначылі актуальнасць даследавання тав. Ерусалімчык, што асабліва відавочна ў святле адзначаемага ў гэтым годзе 50-годдзя першай рускай рэволюцыі. Дацэнты Д. Е. Фактаровіч і В. М. Цімафеева, выступіўшыя з абмеркаваннем работы, указалі на неабходнасць перапрацоўкі першага раздзела з улікам апублікаваных Інстытутам Маркса — Энгельса — Леніна — Сталіна пры ЦК КПСС тэзісаў «Пяцьдзесят год першай рускай рэволюцыі», а таксама далі шэраг іншых каштоўных парад.

Работа, выкананая тав. Ерусалімчык па напісанню дыпломнага даследавання, атрымала станоўчую адзнаку.

Кафедра мае намер і ў далейшым практыкаваць абмеркаванне на сваіх пасяджэннях дыпломных работ.

Б. МІЦКЕВІЧ,
аспірант.

Вучэбныя кінофільмы—студэнтам

Вялікую ролю ў трывалым засваенні матэрыялу, ў пашырэнні кругагляду студэнтаў адыгрывае дэманстрацыя навуковых, а таксама мастацкіх кінофільмаў. Наша клубная кіноўстаноўка намячала прарабіць пэўную работу ў гэтым кірунку. Яшчэ ў пачатку гэтага навучальнага года загадчыкамі кафедраў былі паданы заяўкі на дэманстраванне навукова-папулярных і мастацкіх кінокарцін. Для факультэтаў быў складзены графік паказу кінофільмаў. Усё гэта павінна было дапамагчы студэнтам у авалодванні ведамі. Добра і рэгулярна праходзіў прагляд фільмаў на геаграфічным аддзяленні, гістарычным і біёлага-глебавым факультэтах. Прагляд такіх фільмаў, як «Воронежский заповедник», «Новы Мінск», «Советская Эстония», «В лесах южной Африки», «Советское Приморье» і шэрагу другіх, даў, безумоўна, многае для студэнтаў. Гэта дазволіла грунтоўна замацаваць вывучаны матэрыял. Аб вялікай рабоце, праробленай клубнай кіноўстаноўкай (кіномеханік тав. Семяненя), гаворыць хаця-б тое, што за першы семестр прайшло ўсяго 113 сеансаў навукова-папулярных і іншых кінофільмаў, на якіх пабывала каля 7500 студэнтаў.

Але, калі на геолага-геаграфічным, гістарычным і біёлага-глебавым факультэтах гэтыя мерапрыемствы праходзілі на высокім узроўні, то на іншых справа абстаяла не зусім добра (дарэчы і на геолага-геаграфічным факультэце былі зрывы сеансаў). Звычайна чамусьці нашы адміністратары паказваюць кінофільмы спецыфічна геаграфічныя, біялагічныя і іншыя. Гэта безумоўна добра, але не для ўсіх.

Такія фільмы, якія-б дапамаглі студэнтам-філолагам вывучаць іх дысцыпліны, амаль не паказваліся. З якой цікавасцю і карысцю для сябе прагледзелі-б філолагі «Школу злословия» і другія кінофільмы, якія раскрываюць жыццёвы і творчы шлях пісьменнікаў. Аднак такіх фільмаў студэнты не бачылі, хаця гэтыя фільмы і з'яўляюцца праграмнымі і былі ўключаны ў заяўку загадчыкамі кафедраў філалагічнага факультэта. Адміністрацыйна-гаспадарчая частка, мабыць, таму не жадала атрымоўваць іх, што яны каштуюць на многа даражэй.

Усяго 5 кінофільмаў дэманстравалася для студэнтаў фізмата. Тут спасылаюцца на цяжкасці атрымаць іх з Белкінопраката і наогул на іх недастатковасць. Але, безумоўна, пры жаданні гэтыя памехі можна-б было ліквідаваць.

Пачаўся другі семестр вучэбнага года. Універсітэцкі клуб атрымаў стацыянарную ўстаноўку, якая ўжо ўстанаўліваецца. І неабходна, каб з першых-жа дзён дэманстрацыя кінофільмаў была рэгулярнай і каб кінофільмы паказваліся для ўсіх факультэтаў. Тады гэта будзе сапраўдная дапамога ў вучобе ўсім студэнтам, а не студэнтам асобных факультэтаў.

В. МАЦКЕВІЧ.

Зімовыя канікулы студэнтаў

КАШТОЎНАЯ ЭКСКУРСІЯ

Для азнаямлення з навейшай методыкай, прымяняемай пры вывучэнні фізіялогіі, з новымі дасягненнямі совецкіх вучоных паўлаўскай школы на нашым курсе ў час зімовых канікул была арганізавана экскурсія ў Ленінград.

У Ленінградзе мы пазнаёміліся з работамі, якія праводзяцца ў Інстытуце фізіялогіі імя Паўлава, у Інстытуце фізіялогіі пры ЛДУ імя А. А. Жданава, у Інстытуце эксперыментальнай медыцыны, а таксама ў Калтушах. Мы прысутнічалі пры правядзенні цэлага шэрагу доследаў навуковымі супрацоўнікамі над вывучэннем вышэйшай нервовай дзейнасці чалавека і жывёл.

У біяхімічнай лабараторыі Крэпса і Владзіміра, у інстытуце фізіялогіі вывучаюць абмен вяшчэстваў бялковых злучэнняў у мазгу, прымяняючы радыёактыўны фосфар. Мы пазнаёміліся з некаторымі доследамі па гэтых пытаннях.

У Калтушах, у лабараторыі генетыкі і вышэйшай нервовай дзейнасці, мы наглядалі даследаванне ўплыву раздражэння на вышэйшую нервовую дзейнасць і як гэта перадаецца па спадчыне. Вялікую цікавасць у нас выклікалі доследы над пчоламі ў лабараторыі ніжэйшых жывёл.

Апрача гэтага, мы наведалі Заалагічны музей, адзін з буйнейшых у свеце, Эрмітаж, Рускі музей і інш., дзе сабраны помнікі культуры і мастацтва нашай краіны.

Экскурсія прынесла нам многа карысці. Мы змаглі ўбачыць тое, аб чым чыталі ў кнігах і слухалі на лекцыях.

Н. ЖАЛНЕРЧЫК,
студэнтка IV курса
біёлага-глебавага ф-та

У СТАЛІЦЫ РАДЗІМЫ

З 24 студзеня па 4 лютага ў Маскве на экскурсіі знаходзілася група студэнтаў нашага універсітэта.

Вялікае ўражанне на студэнтаў, якія знаёміліся з асаблівасцямі роднай сталіцы, аказала наведванне Крэмля, дзе яны пабывалі ў Архангельскім і Сафійскім саборах, у Аружэйнай палаце, каля цар-пушкі і цар-звана. Усе экскурсанты пабывалі ў маўзалеі В. І. Леніна і І. В. Сталіна. Многія з іх наведалі Вялікі тэатр оперы і балета Саюза ССР, дзе з цікавасцю праслухалі оперу Мусаргскага „Барыс Гадуноў".

Студэнты наведалі Маскоўскі дзяржаўны універсітэт на Ленінскіх гарах, зрабілі цікавую паездку на аўтобусе па Маскве.

А. УХАНАЎ.

ШЛЯХ ДАРМАЕДА

Пётр Якаўлевіч Чопараў з'явіўся ва універсітэт вераснёўскім ранкам 1951 года.

— Я завочна закончыў чатыры курсы Варонежскага універсітэта і цяпер гару жаданнем закончыць адукацыю ў вашай навучальнай установе,—адрэкамендаваўся ён у рэктараце.

І выпешчаная рука Чопарава палажыла перад тав. Азаранка некалькі скамечаных дакументаў: даведку з экзаменацыйнымі адзнакамі, замацаваную пячаткай Варонежскага дзяржуніверсітэта, аўтабіяграфію. Праўда, у аўтабіяграфіі Пётр Якаўлевіч абыйшоў маўчаннем той факт, што ў тым-жа 1951 годзе ён закончыў яшчэ і Варонежскі настаўніцкі інстытут. Але навошта каму ведаць, што ён не адпрацаваў тры гады па спецыяльнасці? Сумленне комсамольца Чопарава ўжо прызвычаілася маўчаць...

— Што-ж, залічаю вас з павышанай стыпендыяй на пяты курс аддзялення рускай мовы і літаратуры. Спадзяюся, вы знойдзеце кантакт з групай...

А вечарам гэтага дня Пётр Якаўлевіч сапраўды ўзяўся за пошук кантакту з прадстаўнікамі курса. Ідучы паўз асветленыя вітрыны магазінаў і кафэ, ён нашэптваў студэнтцы М. Ш.:

— Цесна маёй паэтычнай натуры ў нашай рэчаіснасці. Пойдзем лепш, коцік, у рэстаран. Во дзе сапраўдны прастор! Так-с...

Так наступілі для Пятра Якаўлевіча бязвоблачныя дні. Часамі іх затуманьвалі думкі аб дзяржаўных экзаменах, і тады ён браўся за работу. Не, ён не раскрываў кніг, ён ішоў у дэканат філалагічнага факультэта і лісліва пазіраў у вочы сакратару Зоі Корбут. Трэба-ж было неяк назбавіцца ад тых троек і чацвёрак, якія стаялі ў даведцы Варонежскага універсітэта. І сакратар уступіла перад яго чарамі. Выпісваючы новую заліковую кніжку, яна ставіць Чопараву ўсюды «выдатна». Дэкан факультэта М. А. Жыдовіч лёгкадумна замацоўвае гэтую фальшыўку сваім подпісам.

І вось маладому спецыялісту настушіў час ехаць на работу. Але Пётр Якаўлевіч не такая натура, каб пахаваць сябе ў вясковай дзесяцігодцы. Там-жа няма рэстарана «Беларусь», няма нават трамвая. Таму Чопараў прыносіць аднекуль з інстытута... эпідэміялогіі даведку аб тым, што ён псіхічна ненармальны і павінен застацца над наглядам мінскіх урачоў. У сапраўднасці-ж у Пятра Якаўлевіча была іншая хвароба—дармаедства. Убачыўшы, што выкладанне ў школе патрабуе напружанай працы, ён хутка змяніў прафесію. У пошуках лёгкага хлеба Чопараў вандраваў то на метэастанцыю, то ў Ленінскую бібліятэку, дзе ён працаваў... бібліятэкарам. Так Пётр Якаўлевіч яшчэ раз абыйшоў пастанову партыі і ўрада аб тым, што кожны выпускнік вышэйшай навучальнай установы павінен працаваць па спецыяльнасці не менш трох год, а ў выпадку ўхілення—прыцягвацца да адказнасці.

Ішлі месяцы. Мяняў прафесіі і прадпрыемствы Пётр Чопараў. Не пакідала яго думка аб кар'еры вучонага мужа. Прабаваў ён пастуціць і ў аспірантуру пры Акадэміі навук БССР, і ў аспірантуру універсітэта па спецыяльнасці «гісторыя партыі». Выстаўляў на паказ сваю адукаванасць, але дзе ты возьмеш гыя веды, калі іх няма! Пры чарговай спробе пастуціць у аспірантуру па кафедры рускай мовы экзамен па спецыяльнасці ён здаў на двойку. Вядома, жыць будучаму вучонаму мужу неяк трэба было, і ён урываўся ў пакой аспіранта Леаніда Белага, прасіў, кідаючы на стол дзве брудныя кашулі:

— Дай, браток, за іх дзвесце рублікаў. Пазнаёміўся з адной генеральскай дачкой—язычок праглынеш. А тут грошыкаў няма вала-ыцца за ёй...

Аднойчы Чопараў без дазволу каменданта насяліўся ў пакоі, дзе ыў тав. Белы. Калі той выказаў незадавальненне няпрошаным суседам, Пётр Якаўлевіч стаў вастрыць брытву:

— Зарэжу цябе! Усёроўна па спраўцы я псіхічна ненармальны...

Але, убачыўшы, што яго праціўнік узяў у рукі прыладу самаабароны, Чопараў пайшоў на ўступкі:

— Я лепш цябе зарэжу ноччу!

Хулігану не ўдалося здзейсніць свае намеры. З дапамогай Л. Белага каменданг выселіў вучонага мужа.

Дзень за днём Пётр Якаўлевіч усё ясней усведамляў, што вельмі цяжка ўхіляцца ад совецкіх законаў, калі іх дасканала не ведаеш. І таму летам 1953 года ён рашыў паступіць у юрыдычны інстытут. На гэты раз Чопараў скрыў, што год назад ён закончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт. Да напышліваў аўтабіяграфіі Пётр Якаўлевіч далучыў толькі дыплом аб заканчэнні Варонежскага настаўніцкага інстытута. Праўда, на заяве былы дырэктар інстытута тав. Павеццеў напісаў: «Запатрабаваць даведку аб стажы работы на спецыяльнасці», але аб гэтым надпісу ў экзаменацыйным пыле хутка забылі.

Уладальнік двух дыпломаў ледзьледзь пралез на конкурсу ў юрыдычны інстытут, каб атрымаці трэці. Але вучыцца яму не хацелася Ён падаў у дэканат заяву з просьбай, каб яму залічылі тыя экзамены, якія ён здаў ва універсітэце, і прыклаў да заявы копію універсітэцкага дыплома. Не, у юрыдычным інстытуце і на гэты раз не выкрылі ашукальніка, не прымусілі яго выканаць абавязак перад Радзімай, яму дабрадушна залічылі некалькі прадметаў. З таго часу Чопараў стаў наведваць заняткі па метаду: хачу—іду, хачу—не.

У другой групе II курса юрыдычнага факультэта і цяпер ад часу да часу з'яўляецца незвычайная постаць Пятра Якаўлевіча. Адны знаходзяць у яго стомленым позірку і доўгіх валасах нешта байранічнае. Другім яго вычвараная мова і старанна выгадаваныя пазногці нагадваюць барчука з мінулага века. Трэція параўноўваюць яго ссутуленую постаць і хітры твар пад нацягнутым капелюшом з адмоўным героем дрэннага фільма—калі адразу ведаеш, што перад табой адмоўны герой. Доўгі час Чопараў стараўся стварыць вакол сябе рамантычную атмасферу таямнічасці. Адным ён гаварыў, што працуе... журналістам у... Акадэміі навук, другім хваліўся, што ў яго бібліятэка ў пяць тысяч тамоў, трэцім скардзіўся, што яму, генію дваццатага века, цяжка працаваць у вячэрняй школе, чацвертым... ды дзе там успомніш усё, што нахлусіў Пётр Якаўлевіч! Нават на пытанне аднакурсніка тав. Гароха, колькі яму год, ён падазрона адказаў:

— Бачыце, я вам гэтага не магу сказаць. Хто ведае, для чаго вам гэтыя даныя...

Але аднакурснікаў не так лёгка было адурыць фіміамам, які кожны дзень курыў сабе Чопараў. Аказалася, што ўсё гэта хлусня. А пасля таго, як Пётр Якаўлевіч прыгразіў студэнтцы І. К., што ён прыкончыць яе, калі яна не будзе згодна з яго думкамі, другакурснікі адвярнуліся ад нягодніка.

Так, у нас кожны мае права на адукацыю. Але і кожны павінен выканаць свой абавязак перад Радзімай, павінен несці ў народ набытыя ім веды. Але гэта не датычыцца Чопарава. Узяць ад грамадства ўсё і не даць яму нічога—яго дэвіз. Замест таго, каб дапамагчы працоўным рублём старэнькай маці, ён сам жыве на сродкі сваёй сястры.

Нядаўна, калі пасля аб'яднання юрыдычнага інстытута з універсітэтам Чопараў прышоў у рэктарат з просьбай дазволіць нераздаць яму экзамен, ён урэшце быў выкрыт. На яго заяве з'явілася рэзалюцыя: «Неравесці на завочнае аддзяленне». Але ці дастаткова гэтага? Дыпламіраванага дармаеда трэба прымусіць працаваць!

А. МАЛЬДЗІС.

БЫВАЮЦЬ І ТАКІЯ...

Студэнтка фізіка-матэматычнага факультэта Б. Дрызіна парушыла правілы пасадкі ў трамвай. На заўвагу міліцыянера яна адказала грубай лаянкай і смехам. Аб гэтым нам паведаміў начальнік 3-га аддзялення міліцыі горада Мінска.

Спадзяемся, што грамадскасць універсітэта прызаве Б. Дрызіну да парадку.

Дрызіна—
студэнтка фізмата,
Чэмпіён
па лаянцы матам.
Яе баіцца
нават міліцыя.

Зноў Егісаран!

«Я пратэстую»,—абурылася нейкая франтавата апранутая асоба, уляцеўшы ў пакой рэдакцыі «За сталінскія кадры». У хуткім часе высветлілася, што гэты гнеўны грамадзянін не хто іншы, як вядомы Егісаран, «гордасць» юрыдычнага факультэта, аб якім ва універсітэцкай газеце быў змешчан фельетон пад назвай «Студэнт-жулік». «Вы, мабыць, не ведаеце, што згодна з існуючым законадаўствам я, кватэранаймальнік, меў поўнае права не плаціць гаспадыні, у якой я кватэраваў, бо паміж намі не было яшчэ пісьмовага пагаднення, падпісанага абодвума бакамі і заверанага з захаваннем усіх неабходных фармальнасцей. А таму не маецца ніякіх юрыдычных падстаў прыцягваць мяне да ўплаты за пражытыя мною на кватэры месяцы».

Члены рэдакцыі, не будучы спецыялістамі ў галіне права, маўчалі, агарошаныя важкімі аргументамі, якія вельмі густа перасыпаліся нумарамі артыкулаў грамадзянскага кодэксу.

Бачна, на той-жа падставе, што паміж Егісаранам і адміністрацыяй рэстарана на прывакзальнай плошчы не было пісьмовага дагавору, па якому Егісаран абавязаўся-б плаціць за выпітую аднойчы вечарам гарэлку і за з'едзеныя аднойчы вечарам шніцалі і біфштэксы, знаток законаў рашыў выкарыстаць свой практычны вопыт і збегчы зноў, нічога не заплаціўшы.

Але шчасце павярнулася спіной да п'яніцы. Нічога яму не дапамагло—ні ўзняты скандал, ні лаянка з ужываннем юрыдычнай тэрміналогіі. Егісарана затрымала міліцыя. Быў складзены акт, які перададзен ва універсітэт для прыняцця адпаведных мер нашай грамадскасцю і адміністрацыяй.

Напрашваецца пытанне—ці не даволі маецца законных падстаў, каб адабраць студэнцкі білет у гэтага дэбашыра, які не мае ніякіх маральных праў прадстаўляць у будучым совецкае правасуддзе.

А. ПЯТРОЎСКІ.

Прохвост

Студэнт юрыдычнага факультэта Курдзюкоў сам паставіў сабе ў ведамасці „выдатна" па грамадзянскаму праву, падрабіўшы подпіс выкладчыка. Ён быў выкрыты ў час налічэння яму павышанай стыпендыі.

Он, виды видевшая птица,
Студент юрфака Курдюков:
В глазах других
Хотел он взвиться
До самых дальних облаков,
По-над полями,
Над лесами
Парить стремительным орлом...
Желал он на «пять» сдать экзамен,
Хоть как-нибудь, хоть напролом.
Он каждой клеткой
жаждал славы,
Ловил маячащую цель.
Но... по гражданскому он праву
Совсем нежданно сел на мель.
Тогда вполне «самокритично»
(Он знает строгий наш закон)
Собственноручное «отлично»
Поставил в ведомости он.
Не сильный в правовых науках,
Прохвоста спрашиваю я:
Какая
за такие штуки
Ему положена статья?

А. ХАРКЕВИЧ.



„ПАШКАДУЙЦЕ НАС!"

Студэнткі Аўраменка і Барташук (філалагічны факультэт), спасылаючыся на мнімыя хваробы, пры здачы экзаменаў выпрошвалі ў экзамінатара і дэкана розныя паблажкі.

У вас, товарищ, не мигрень
И не склероз подлобье точит.
У вас огромной силы лень
Мозги свернула набекрень
И завихнуть назад не хочет.

Сергей ВАСИЛЬЕВ.

Па слядах нашых выступленняў

«ГРАМАДСКАЕ ХАРЧАВАННЕ СТУДЭНТАЎ—СПРАВА ВЯЛІКАЯ І СУР'ЁЗНАЯ»

Пад такім загалоўкам у нашай газеце былі змешчаны матэрыялы аб рабоце сталовых і буфетаў універсітэта.

Як паведаміў нам загадчык Мінскага гарадскога аддзела гандлю К. Ластоўскі, выступленне газеты было абмеркавана на нарадзе з кіраўнікамі гандлюючых арганізацый і загадчыкамі сталовых. Намечаны мерапрыемствы па ліквідацыі недахопаў, адзначаных у газеце.

За незабеспячэнне кіраўніцтвам сталовай БДУ загадчык сталовай Ракаўшчык з работы зволен.

Дырэктару фабрыкі-кухні Хадзееву дадзена ўказанне аб першачарговай выдачы прадуктаў студэнцкім буфетам і сталовым.

Метад увядзення самаабслугоўвання ў студэнцкіх сталовых Горгандальаддзел лічыць празільным, бо гэты метад шырока прымяняецца ў Маскве, Ленінградзе і іншых гарадах, як апраўдаўшы сябе і рэкамендуемы Міністэрствам гандлю Саюза ССР.

Рэдактар В. Л. ШАЦІЛА.

АТ 01230 Мінск, друкарня Выдавецтва Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна. Тыраж 1000 экз. Зак. 123